# ТЭМАТЫЧНАЯ РАЗНАСТАЙНАСЦЬ І ВЫХАВАЎЧАЕ ЗНАЧЭННЕ СУЧАСНАЙ ІСПАНСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ КАЗКІ

*А.А.Макарэвіч (Мінск, МДЛУ)*

У артыкуле разглядаецца тэматычны дыяпазон і значэнне ў выхаванні дзяцей сучаснай іспанскай літаратурнай казкі. Сярод найбольш распаўсюджаных тэм былі вылучаныя наступныя: экалогія, адносіны паміж пакаленнямі, працавітасць, мэтанакіраванасць, сіла духу. Вызначана, што галоўнымі маральна-каштоўнаснымі арыенцірамі для іспанцаў выступаюць сям'я, сяброўства, прынцыпы роўнасці і мірнага суіснавання розных народаў.

**Ключавы словы:** *дзіцячая літаратура; аўтарская казка; літаратурная казка; іспанская літаратура; выхаванне дзяцей; маральныя каштоўнасці.*

# THEMATIC DIVERSITY AND EDUCATIONAL SIGNIFICANCE OF THE MODERN SPANISH LITERARY FAIRY TALE

*A.A.Makarevich (Minsk, MSLU)*

The article examines the thematic range and importance of modern Spanish literary fairy tales in the upbringing of children. Among the most common topics, the following were highlighted: ecology, intergenerational relations, diligence, purposefulness and fortitude. It was determined that the main moral and value orientations for Spaniards are family, friendship, principles of equality and peaceful coexistence of different peoples.

**Key words:** *children's literature; author's fairy tale; literary fairy tale; Spanish literature; education of children; moral values.*

Дзіцячая літаратура з'яўляецца важнай часткай сучаснай літаратуры, бо ўплывае на станаўленне будучай асобы і садзейнічае фарміраванню каштоўнасных арыентацый. Літаратурная казка – адзін з асноўных жанраў, мэтавай аўдыторыяй якога, у адрозненне ад фальклорнай казкі, выступаюць дзеці, а не дарослыя, таму дадзеныя творы ўлічваюць іх узроставыя асаблівасці, патрэбы і інтарэсы. дадзеныя творы ўлічваюць іх узроставыя асаблівасці, патрэбы і інтарэсы. Значэнне дадзенага жанру ў выхаванні вывучаюць такія сучасныя даследчыкі, як Р. Гарсіа [1], М. Матэа Пеньялвер і М. Гомес Амарос [2]. У дадзенай рабоце мы прааналізавалі "*Зборнік ілюстраваных казак*" (2010–2011 г.) і вылучылі актуальныя тэмы і праблемы іспанскіх твораў для дзяцей [3].

***Аўтарская казка*** – гэта мастацкі твор, створаны і перададзены ў пісьмовай форме, з дакладна вядомым аўтарам і адзіным варыянтам існавання, у якім апавядаюцца рэальныя або выдуманыя падзеі, дзве галоўныя мэты якога: пацешыць і навучыць [2]. Казкі з'яўляюцца не толькі сродкам забаўлення дзяцей, але і знаёмяць іх са светам навокал, вучаць новаму ў захапляльнай форме. У творы *"Паў, ложак і павукі"* М. К. Лавадор Мартынес бабуля прыдумвае для ўнука цікавыя гісторыі, у якіх распавядае пра розных відаў павукоў і вучыць, як трэба сябе з імі паводзіць. А ў казцы *"7 магічных матылькоў"* Д. Сеговья прапануе сваю версію таго, чаму рэчы навокал маюць менавіта такія колеры.

Другая важная задача літаратурных казак – дапамога ў вырашэнні праблем, адпаведных пэўнаму ўзросту. У казцы *“Клара і мышаня Перэс”* Р. Фрутас Эранса дзяўчынка пакутуе ад таго, што ў яе выпаў зуб і што ад гэтага яна непрывабная. Маці тлумачыла дачцэ, што дадзеныя змены ў яе целе цалкам нармальныя, а мышаня Перэс, іспанскі аналаг зубной феі, дапамог дзяўчынцы зразумець, што адсутнасць зуба не робіць яе непрывабнай.

У якасці істотнай функцыі сучаснай аўтарскай казкі іспанскія даследчыкі вылучаюць дапамогу ў сацыялізацыі дзяцей [1, с. 331], развіцце здольнасцей будаваць адносіны з іншымі дзецьмі і працаваць у камандзе. Матылькі ў творы Д. Сеговы выконваюць кожны сваю справу і не спрабуюць высветліць, хто з іх галоўны, разумеючы, што яны працуюць для адзінай мэты. Тэма сяброўства і роўнасці аб’ядноўвае і герояў твора “*Магічны свет*” А. Арасіль Клімент, якія разам выкарыстоўваюць свае здольнасці, каб вярнуць святло ў зачараванае каралеўства. Акрамя гэтага, у казках М. К. Лавадор Мартынес і Ф. Лільі Мартынеса *“Стары і гара”* вялікае значэнне надаецца праблеме ўзаемаадносін паміж пакаленнямі, адзначаецца супрацьпастаўленне мудрасці і дасведчанасці старых энергічнасці і цікаўнасці дзяцей.

У большасці з прааналізаваных твораў пісьменнікі канцэнтруюць увагу на духоўным развіцці маладога пакалення. Важнымі для сучаснага іспанскага грамадства застаюцца такія маральныя каштоўнасці, як роўнасць, павага да іншых, салідарнасць, суіснаванне, шчодрасць, клопат аб навакольным асяроддзі [2]. Тэма экалогіі закранаецца ў казцы М. Х. Аргуэлье Мартынес *“Птушка, якая не хацела лятаць”*, у якой апавядаецца пра неабходнасць догляду прыроды з боку чалавека, а таксама тлумачыцца кругаварот рэчываў у прыродзе. У творы *“Магічны свет”* вылучаюцца такія рысы характару, як легкасць, спрыт і адвага, якія дапамагаюць выратаваць зачараваных істот. У казцы *“Стары і гара”* апісваецца мэтанакіраванасць і перавага духоўных сіл над фізічнай слабасцю. Разам з гэтым важнейшай каштоўнасцю для іспанцаў застаюцца блізкія сямейныя адносіны (*“Каляды з Мэгі”*, *“Стары і гара”*, *“Паў, ложак і павукі”*).

Акрамя гэтага, іспанскія даследчыкі выдзяляюць казку як важны выхаваўчы рэсурс, бо яна набліжае дзяцей да культуры сваей краіны і знаеміць з культурамі іншых краін [2]. Дадзеная задача выдатна выконваецца ў творы *“Залацісты міраж”* Р. Праанье Варгаса, у якой апісваецца культура інкаў, аднаго з карэнных народаў Амерыкі. Заваяванне Новага Света з’яўляецца неад’емнай часткай іспанскай гісторыі. Пры гэтым аўтар вучыць правільнаму суіснаванню розных народаў, заснаванаму на ўзаемадапамозе і павазе, што спрые фарміраванню дзіцяці як полікультурнай асобы.

Вышэй пералічаныя задачы напраўленыя на рэалізацыю павучальнай функцыі літаратурнай казкі. Разам з гэтым казка выступае як забаўляльны сродак. У дадзеным зборніку гэтая мэта выконваецца пры дапамозе апісання святаў, а менавіта Раства і Калядаў, якія асацыююцца ў дзяцей з весялосцю і падарункамі (*“Каляды з Мэгі”*, *“Магічны свет”*, *“7 магічных матылькоў”*).

Такім чынам, мы можам адзначыць, што аўтарская казка з'яўляецца важным выхаваўчым сродкам, які дапамагае дзецям знаеміцца з навакольным светам, вырашаць актуальныя для іх узроста праблемы, сацыялізавацца. Разнастайная тэматыка твораў спрые духоўнаму развіццю дзяцей і заснаванню галоўных маральных каштоўнасцей: сям'я, працавітасць, сяброўства, адважнасць, мэтанакіраванасць. У сучаснай іспанскай літаратуры большая ўвага надаецца такім тэмам, як ахова прыроды, роўнасць, сіла духу, суіснаванне розных народаў і культур.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. García, R. El cuento infantil como herramienta socializadora de género / R. García // Cuestiones pedagógicas. – 2012–2013. – № 22. – С. 329–350.
2. Mateo Peñalver, E. La literatura infantil / E. Mateo Peñalver, M. Gómez Amorós // Expresión y comunicación / E. Mateo Peñalver, M. Gómez Amorós. – Madrid, 2018. – Un. 2. – P. 31–51.
3. Recopilación de cuentos ilustrados realizados en los cursos "Escritura
4. creativa", "Ilustración de albumes infantiles" // Programa Alicante Cultura. – 2010–2011. – URL : https://www.miguelturra.es/sites/default/files/ generico_archivos/cuento_cuentos _ilustrados.pdf (date of access: 03.02.2025).